Адразу скажу: нападкі на беларускую мову ў Беларусі, абраза яе — з'ява не новая і малапаважная. Не пазбеглі яе і Вы, Іван Андрэевіч, хоць і завяраеце ў сваёй любові да Беларусі. А Беларусь жа і беларуская мова — непадзельныя.

Пачнём з сухіх лічбаў, за якімі заўжды стаяць аб'ектыўныя факты.

Вы лічыце, што прэзідэнт Беларусі мае рацыю, калі называе, што ў Беларусі зараз жыве 2,5 мільёна рускіх. Між тым апошні перапіс насельніцтва нашай краіны ў 1989 годзе сведчыць, што рускіх тады на Беларусі было амаль ў два разы меней — 1342 тысячы чалавек. Наўрад ці гэта лічба зараз павялічылася істотна.

Аднак перапіс высветліў і тое, што 50 тысяч мясцовых рускіх роднай мовай сваёй назвалі беларускую. Не адпавядае рэчаіснасці і другая Ваша лічба — быццам 100 працэнтаў гарадскога насельніцтва размаўляе толькі па-руску.

Дарэчы, сярод тых 50 тысяч — і я, сын валагодскага селяніна і беларускай дзяўчыны, якая нарадзілася ў Чалябінску. Я ж нарадзіўся і вырас у Мсціславе, гадавала мяне беларуская бабуля, і калі прыйшоў у першы клас, то рускай мовы не ведаў, затое добра гаварыў на мсціслаўска-смаленскім (крывіцкім) дыялекце беларускай мовы...

Потым была руская школа, Беларускі дзяржаўны універсітэт у Мінску, дзе ўсе прадметы выкладаліся толькі па-руску, аспірантура, абарона кандыдацкай дысертацыі ў Ленінградзе. І — поўны пераход на беларускую мову ў другой палове васьмідзесятых. Вось ужо больш за дзесяць год уся мая сям'я размаўляе па-беларуску. І робім мы гэта з вялікім задавальненнем і радасцю. Бо карыстаемся цудоўнейшай, прыгажэйшай мовай, якую геній сусветнай паэзіі і наш слынны зямляк Адам Міцкевіч лічыў самай самабытнай і мілагучнай са славянскіх моў...

А зараз крыху канкрэтнай статыстыкі з энцыклапедычнага даведніка "Беларусь" (выданне 1995 года) наконт рускага насельніцтва на Беларусі.

Расійская імперыя, якую Ленін трапна назваў "турмою народаў", канчаткова захапіла Беларусь у самым канцы XVIII стагоддзя. Аднак яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя рускіх на нашай зямлі было толькі 10 тысяч, альбо 0,3 працэнта насельніцтва. У канцы XIX стагоддзя іх стала ўжо 235 тысяч, ці 3,6 працэнта.

Але масавае засяленне Беларусі рускімі адбылося ўжо ў савецкія часы: 1926 год — 384 тысяцы (7,7 працэнта); 1959 — 659 тысяч (8,2 працэнта), 1970 — 939 тысяч (10,4 працэнта); 1979 — 1134 тысячы (11,9 працэнта).

Як вы лічыце, чаму людзі з Расіі масава ехалі ў разбураную войнамі Беларусь з шырокіх берагоў Акі і Волгі? Чаму яны мянялі шырокія стэпы і неабдымныя сібірскія прасторы на пінскія балоты, разбітыя і спаленыя Мінск, Віцебск, Магілёў, Брэст? Чаму афіцэры-адстаўнікі замест сваёй Разані ці Тулы масава сяліліся ў Мінску, Барысаве і Гродне? Таму што іх сустракалі і ўладкоўвалі тут найлепшым чынам, наколькі гэта было магчыма.

Мы павінны аддаць належнае большасці з гэтых людзей, што разам з беларусамі адбудоўвалі разбураныя вайной гарады і вёскі, працавалі ў навукова-даследчых установах, ВНУ, былі медыкамі і лётчыкамі, рабочымі і шахцёрамі. Яны нямала добрага і карыснага зрабілі на нашай зямлі, і мы ўдзячны за гэта.

Аднак разам з расіянамі на Беларусь прыйшла да нас не толькі літаратурная руская мова, якой валодалі пераважна інтэлігенты, але і бытавы "савецкі сленг", славуты "рускі мат", а часам і непавага да беларускай мовы і культуры: навошта яе вывучаць, лепш высмяяць, прынізіць і адкінуць, як непатрэбную. Не пазбеглі гэтага "віруса" і Вы, Іван Андрэевіч.

Між тым варта нагадаць, што калісьці ў падобным становішчы Папялушкі была і сама руская мова. Не ўсе ведаюць, як змагаўся за рускую мову Міхайла Ламаносаў у XVIII стагоддзі. У тагачаснай рускай Акадэміі навук, дзе працавалі адны немцы, рускую мову зневажалі як "мужыцкую, халопскую". Ды і напачатку XIX стагоддзя амаль уся руская знаць размаўляла ў асноўным па-французску (па-руску — толькі са слугамі ды мужыкамі). Нават будучы стваральнік літаратурнай рускай мовы Аляксандр Пушкін свае першыя вершы пісаў па-французску. А калі выдаў сваю бліскучую паэму "Руслан і Людміла", яго сталі бэсціць за "мужыцкі дух", які абражае "тонкі" арыстакратычны густ...

Але вернемся бліжэй да сучаснасці.

...Прыезжыя з Расіі ў Беларусі занялі большасць кіруючых пасад у партыйным і савецкім апараце, войску, міліцыі, КДБ, школах, ВНУ і навукова-даследчых інстытутах. На жаль, яны нярэдка паводзілі сябе тут, як калісь немцы і французы ў Расіі. Навошта ім і іх дзецям "тлуміць мазгі": вывучаць беларускую, мясцовую мову? Мала таго — няхай і ўсе тутэйшыя жыхары, карэнныя беларусы, а таксама палякі, украінцы, татары, яўрэі вывучаюць толькі адну рускую мову.

І кіраўніцтва СССР і рэспублікі цвёрда трымалася гэтай бязглуздай лініі. Вось яскравы прыклад. Мікіта Хрушчоў, будучы ў Мінску, стоячы на ганку Беларускага дзяржаўнага універсітэта, заявіў, што беларусы першымі пабудуюць камунізм, бо першыя цалкам пяройдуць на рускую мову. Таму і зачыняліся беларускія ВНУ і школы, а тых, хто быў не згодзен з гэтым, у лепшым выпадку выкідвалі з работы. А ў 30-я гады сотні і тысячы беларусаў толькі за прыхільнасць да роднай мовы былі расстраляны ў Курапатах ці сасланы на Калыму і іншыя не менш страшныя месцы. Сярод першых такіх бязвінных ахвяр — беларускія акадэмікі Вацлаў Ластоўскі і Язэп Лёсік, мастацтвазнаўца Мікола Шчакаціхін, пісьменнікі Максім Гарэцкі і Уладзімір Дубоўка, многія-многія іншыя, кім павінны былі б ганарыцца і ўсім мірам шанаваць, а не зводзіць у магілу за любоў да мовы сваіх продкаў.

Я запрашаю Вас, шаноўны Іван Андрэевіч, прыехаць у Мінск і пагаварыць з вучнямі і бацькамі адзінага на Беларусі беларускага ліцэя, якія ўжо два гады змагаюцца з адміністрацыяй прэзідэнта за тое, каб вучыцца па-беларуску. Прыйдзіце на любы мітынг апазіцыі, і Вы пачуеце, як прыгожа і ўзнёсла размаўляюць па-беларуску сотні маладых хлопцаў і дзяўчат. Альбо зайдзіце ў Салігорскую ці іншую якую бібліятэку, дзе паважаюць таленавітых майстроў беларускага слова, і прачытайце хаця б "Мёртвым не баліць" Васіля Быкава, "Ладдзю роспачы" Уладзіміра Караткевіча, вершы Барадуліна, Разанава, Бураўкіна, кнігі іншых цудоўных пісьменнікаў. Няўжо Вы не адчуеце іх пранікнёнасць, вобразнасць, прыгажосць?

А яшчэ я Вам раіў бы выпісаць газету Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны "Наша Слова". Там, спадзяюся, Вы знойдзеце адказы на многія Вашыя пытанні і развагі. У тым ліку і аб тым, ці звязаны моўныя праблемы з эканамічнымі. І ці паважаюць у свеце тых, хто не паважае сам сябе, адмаўляючыся ад уласнага, нацыянальнага. Магчыма, што з цягам часу Вы ў нечым зменіце свае адносіны да беларускай мовы.

Мову, як і маці, ніхто не выбірае. А знявага роднай маці — найцяжэйшае злачынства ў свеце. Вы пішаце аб "любви к родине, милой родной Беларуси". Але ж няма Беларусі без беларускай мовы — душы народа! Без яе — не Радзіма, не краіна, а ўсяго толькі абездухоўленая "тэрыторыя". Ці ж можна любіць "тэрыторыю"? Падумайце над гэтым.

Жадаю Вам, сталаму падпісчыку "Народнай волі", моцнага здароўя і доўгага жыцця. Спадзяюся, што мы з Вамі дачакаемся перамогі дэмакратыі і свабоды ў нашай краіне, а значыць, разам з народным дабрабытам — і росквіту беларускай мовы і культуры на нашай святой зямлі. Менавіта за гэта так актыўна змагаецца "Народная воля".

З павагай —

Алег ТРУСАЎ,
першы намеснік старшыні Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, кандыдат гістарычных навук.

Жыццё як яно ёсць

Апладысменты ў аванс і пад "адабрамс"

Зала Палаца культуры, дзе вось-вось павінен быў пачацца двухдзённы рэспубліканскі тэлефестываль "Залатыя ключы", прыціхла ў чаканні выхаду на сцэну вядучых праграмы. Канцэрт хвілін на пятнаццаць затрымліваўся з-за пэўнай негатоўнасці тэлевізіёншчыкаў. І тут з-за кулісаў выбегла маладая жанчына з мікрафончыкам у руцэ і аб'явіла:

— Сначала мы с вами дружно поаплодируем — для записи вашего одобрения концерта впрок. И так — начали! Подружнее!

Запоўненая да адказу зала (каля 400 гледачоў) узарвалася пошчакам апладысментаў.

— Еще раз и подружнее — с поднятыми над головами руками! — скамандавала жанчына. — Вы потом, когда запись концерта выйдет в эфир, сможете увидеть себя на телеэкране. Дружно!

Зноў і зноў — сем разоў запар! — зала паслухмяна біла ў ладкі. Не менш дзесяці мінут. І калі ўжо, здавалася, былі пяройдзены нормы здаровага сэнсу гэтага апладыравання "впрок", жанчына, пасля кароткай паўзы, зноў выбегла на сцэну.

— И еще разок дружно похлопаем!

Ёй не адмовілі, праўда, пажылыя людзі, а іх было няшмат у зале, устрымаліся ад рукапляскання. А моладзь, здавалася, гатовая была біць у ладкі і далей.

Потым на сцэну выйшла абаяльная і тактоўная вядучая канцэрта і на беларускай мове "павяла" вечар. Канцэрт быў цудоўны, у ім прынялі ўдзел многія мастацкія калектывы з усіх канцоў рэспублікі.

Пра тую зацяжную "разминку" тэлевізіёншчыкаў з рукаплясканнем можна было б і не ўспамінаць, калі б на памяць не набегла другая падобная сцэнка масавага "адабрамса".

У той жа зале, у сярэдзіне лета выступаў славуты Кубанскі казацкі хор, які наведаў Слуцк. Білеты былі раскуплены за тыдзень да іх прыезду. Дзве гадзіны працягваўся канцэрт, які прынёс шмат радасці ад непаўторных "агнявых" казацкіх песень і танцаў.

На жаль, настрой многім гледачам крыху сапсаваў мужчына невялікага росту, у шэрым пінжаку, якога вядучыя прадставілі як адміністратара хору. А павёў ён гамонку па сцэнарыі небезвядомых расійскіх нацыяналпатрыётаў. Чамусьці прамоўца запрарочыў Расіі "новое Куликово поле", маўляў, зноў трэба славянам збірацца на ім, каб "дать бой оккупантам и предателям России", "освободить ее от нового Хан-Батыя". А пад канец напомніў сядзеўшым у зале жахарам Слуцка, што для гэтага трэба аб'яднацца Расіі, Украіне і Беларусі. Гаварыў эмацыянальна напорыста — у стылі Ампілава і Баркашова. І думаеце, зала абсвістала іх агітатара з Кубані? Нічога падобнага! Зала адказала дружнымі апладысментамі, не меней гарачымі, чым на выступленні таленавітых танцораў і спевакоў.

Божа, як увайшла у плоць і кроў нашых людзей шматгадовая практыка ўсеагульнага "адабрамса" — ці то на выбарах дэпутатаў у Вярхоўны Савет, ці то на прэзідэнцкіх рэферэндумах! Няўжо мы не навучымся паважаць сябе як нацыя, разлічаць, дзе сапраўднае зерне, а дзе — шалупінне з чужога агароду?

Мікола КУТНЯВЕЦКІ.

Закулисье

Уникальная карьера: из министров — в обслугу

Бывший министр спорта и туризма Беларуси Владимир Макейчик наконец-то нашел работу. Он стал помощником у Владимира Коноплева — заместителя председателя Палаты представителей так называемого Национального собрания.

Полгода экс-министр числился безработным. Сначала, после бурного разноса, устроенного ему президентом Александром Лукашенко в присутствии многочисленных сотрудников спортивного ведомства, Владимира Иосифовича подкосила болезнь. Потом, после выхода из больницы, даже бывшие друзья и товарищи остерегались брать под свое крыло опального чиновника. И потому Макейчику пришлось, расставшись со своим прекрасным кабинетом, пообивать пороги чужих.

Помогла дружба с другом детства президента Владимиром Коноплевым. Два Володи раньше нередко вместе играли в футбол. А поскольку Макейчик в свое время заканчивал Институт физкультуры и специализировался в хоккее, то теперь, возможно, тезки будут гонять вместе шайбу. Футбольная команда правительства и парламента уже существует. Если к Макейчику и Коноплеву добавить еще и президента Лукашенко, который также большой любитель хоккея, — вот вам и ударная первая тройка. Правда, хоккей конечно же не футбол. Здесь невзначай могут и тумаков надавать. Только осмелится ли кто-нибудь применять силовые приемы против таких необычных форвардов?

Владимир КОТ.

Творчасць чытачоў

Паважаная газета "Народная воля"! Дасылаю вам свой новы верш. Не ведаю, надрукуеце яго ці не. Але ў ім я выліў сваю душу. Топчацца і гіне беларуская мова. Як яе абараніць?

Я чытаю вашу газету, паважаю і цаню. Яна мяне натхняе. Ёю я жыву.

Васіль ГАЙДА.

Гродна.

Беларуская зямля

Што сталася з табой, зямля?
Ты плачаш, нібы немаўля,
Якое без нагляду ў хаце
Пакінула ў калысцы маці.

Няма каму з ім размаўляць
І роднай мове навучаць,
Нібыта ёй няма цаны
І не было ў нас Скарыны.

Што сталася з табой, Зямля!
Ты плачаш, нібы немаўля.
Калі ж, матуля, ты ізноў
Патурыш з хаты груганоў?

Міністр эканомікі Уладзімір Шымаў прызнаў непрымальнасць сітуацыі, калі 70 працэнтаў знешнегандлёвага абароту Беларусі прыпадае на Расію

Міністр эканомікі Беларусі Уладзімір Шымаў прызнаў непрымальнасць сітуацыі, калі 70 працэнтаў знешнегандлёвага абароту краіны "замкнута на Расію". Ён звярнуў увагу на недастаткова асвоены беларускімі вытворцамі вялікі рынак Украіны, краін Усходняй Еўропы, Афрыкі, Азіі, лічачы неабходным дакладна вывучаць яго і праводзіць мэтанакіраваную палітыку для пашырэння ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

Як паведаміў У.Шымаў, для павышэння канкурэнтаздольнасці айчынных тавараў на сусветным рынку ўрад уводзіць новы механізм вызначэння экспартнай цаны — "значна больш ільготны для экспарцёраў". Цяпер гэтая цана можа вызначацца суб'ектам гаспадарання, зыходзячы з яго фінансавага становішча і кан'юнктуры цэн на асноўных рынках збыту.

Нагадаем, што дагэтуль экспартная цана вызначалася на аснове ўнутранай з пералікам у валюту па курсе Нацыянальнага банка.

А паколькі, па словах міністра, гэты курс — завышаны, цэны атрымліваліся вельмі высокімі, што рабіла тавары неліквіднымі на знешніх рынках. На думку Уладзіміра Шымава, крызісы маюць "адзін станоўчы зарад — мабілізуюць унутраныя рэсурсы і рэзервы дзяржавы, сістэмы кіравання, суб'ектаў гаспадарання".

Юрый КУЗНЯЦОЎ, БелаПАН.

Демократия по-белорусски

Ответа от властей профсоюзы так и не получили

Республиканские комитеты профсоюзов, объединяющих работников промышленных отраслей народного хозяйства страны, выступили с совместным заявлением по поводу игнорирования властями требований участников июльского митинга трудящихся, который прошел в Минске.

"Ответа от властей мы так и не получили, — заявил на встрече с журналистами председатель республиканского комитета профсоюза металлистов Иван Колесник. — Складывается впечатление, что предложения трудящихся по разрешению социальных и экономических проблем предприятий и трудовых коллективов, а также по улучшению материального положения населения страны никого не волнуют".

Профсоюзы расценили такое отношение к требованиям трудящихся как несоответствующее нормам Конституции и закону "Об обращениях граждан" и подчеркнули это в своем заявлении.

Валентина МЕНЬШИКОВА, БелТА.

Народная Воля
17 ВЕРАСНЯ 1998 г.

Зеркало

Человек Горбачева, взятый на службу Ельциным

"Стампа" (Италия):

Газета публикует очерк известного журналиста Джульетто Кьеза, который рассказывает о личных впечатлениях о Евгении Примакове. В статье, в частности, говорится:

"Это можно сравнить с тем, когда возвращаешься домой, шатаясь, в шоке, после аварии на дороге или после нападения грабителей. Получив в качестве главы правительства Евгения Примакова, вся Россия вздохнула. К сожалению, дела у него легко пойти не смогут, но парадокс состоит в том, что человек, призванный повести страну в будущее, — типичный продукт прошлого.

Я до сих пор помню нашу первую беседу в гостинице в Дели, куда он прибыл в качестве советника Горбачева. За час сердечной беседы, усеянной шутками, он ухитрился ничего не сказать мне такого, что я мог бы использовать. Это была аппаратная глыба, замочная скважина сейфа.

Сегодня, в 68 лет, он не изменился. Его правило всегда состояло в том, что лучше недоговорить, чем сказать лишнее слово. Так делается меньше ошибок, а любопытство окружающих возрастает. Но тот, кто доверил ему тайну, может быть совершенно спокоен.

Его можно было бы сравнить с животным, которое маскируется под окружающую среду. Это объясняет его удивительную способность вписываться в любую картину. Но это вовсе не означает, что у него нет собственных идей.

Никто не может назвать его реформатором. Но, возможно, именно он проведет в России реформы. При этом не будет кричать на каждом углу, что он — рыночник".

Киев: кредиторы голосуют ногами

"Файнэншл таймс" (Великобритания):

"Украинский рынок ценных бумаг замер после того, как правительство предложило либо "добровольную" реструктуризацию долга по ставкам ниже рыночных, либо дефолт.

Предоставление Украине первого транша кредита МВФ в 256 млн. долл. не остановило инвесторов, которые не хотят больше покупать ценные бумаги.

Страна, которая еще в июле, казалось, справилась наконец с финансовым кризисом, длившимся месяц, когда решался вопрос о выделении МВФ кредита сроком на 3 года в 2,2 млрд. долл., снова погрузилась в хаос после крушения рубля в соседней России. За последние три недели гривна потеряла около 30 процентов своей стоимости — с 2,1 гривны за доллар до 3 гривен. Это произошло из-за того, что инвесторы стали сбрасывать правительственные ценные бумаги и покидать страну".

Производители чая: Москва — удар ниже пояса

"Соле — 24 оре" (Италия):

"Производители чая опасаются дальнейшего снижения котировок на фоне ожидаемого значительного сокращения заказов из России. Подешевению может также содействовать ожидаемый рост урожая. Больше всего озабочены производители Шри Ланки, главного мирового экспортера чая. Москва — самый главный клиент Коломбо: в прошлом полугодии она закупила почти 28 млн. тонн, то есть 20 процентов всего объема ланкийского экспорта чая".

Российский кризис топит европейское свиноводство

"Вангуардия" (Испания):

"Цены на европейскую свинину страдают от тяжелейшего кризиса последних десяти лет в Европе: с середины лета они опустились на 30 процентов. Эксперты объясняют это перенасыщенностью предложения, вызванной в значительной степени фактическим прекращением экспорта в Россию. Нынешнее перепроизводство свинины, которое Европейская комиссия оценивает на 1998 год в 600 тыс. тонн, кажется парадоксальным: всего два года назад из-за эпидемии чумы в Западной Европе были уничтожены несколько миллионов голов свиней. Падение цены на этот продукт, особенно в Испании, Германии, Франции, Голландии, Дании и Великобритании, вызвало тревогу своим резким характером, поскольку оно произошло немногим более чем за один месяц".

Экономический кризис затянул тучами перспективы реформ в Индонезии

"Вашингтон пост" (США):

"После почти 100 дней пребывания у власти президент Хабиби сталкивается с давлением, аналогичным тому, которое в мае свергло его предшественника и учителя. Хотя Хабиби начал политические реформы, индонезийцы оценивают степень его успеха по тому, что они могут купить в условиях углубления экономического кризиса, а не по тому, насколько свободно они смогут голосовать на выборах будущего года.

На экономическом фронте мало что изменилось, чтобы уменьшить растущее разочарование миллионов людей, потерявших работу и сваливших в нищету после начала год назад экономического кризиса. Темпы инфляции — 70 процентов в год — самые высокие за 30 лет, цена риса удвоилась с момента, когда в мае под давлением манифестаций протеста президент Сухарто покинул свой пост".

О перспективах экспорта никеля

"Соле — 24 оре" (Италия):

"Потребление никеля в нынешнем году сократится по сравнению с 1997 годом, хотя и не катастрофическим образом. После 8 лет роста в среднем на 4,7 процента, вызванного значительным ростом производства нержавеющей стали, никельная отрасль затормозится. Мировые излишки составят 21 тысячу тонн в текущем и 23 тысячи тонн в будущем году.

Но на этом фоне кризис рубля обещает удержание уровня цен. На прошедшем в Париже семинаре господствовало мнение, которое связывало валютные проблемы с крахом продажи. Обвал рубля означает блокирование поставок оборудования и прекращение финансирования банками экспорта".

О санкциях ООН против Ирака

"Хандельсблатт" (ФРГ):

"Совет Безопасности ООН единогласно принял решение прекратить все проверки соблюдения Ираком санкций ООН. Оно будет действовать до тех пор, пока Багдад будет отказываться от сотрудничества с ооновской спецкомиссией по Ираку. Соответствующее решение Ирака от 5 августа подверглось осуждению. Совет Безопасности снова подчеркнул свою полную поддержку Ричарда Батлера, главного инспектора спецкомиссии.

Ирак потребовал от СБ изменить персональный состав спецкомиссии. Багдад настаивает, чтобы в комиссию входило по одному представителю от каждой страны — постоянного члена СБ ООН. А председатели ее должны подлежать ротации.

Госсекретарь США Мадлен Олбрайт пригрозила иракскому президенту Саддаму Хусейну "быстрым и массированным" ответом".

Евро: от теории — к практике

Для того, чтобы переход на новую денежную единицу евро прошел успешно, французское правительство разработало специальную программу, которая включает в себя рекламу, принятие банковских мер и другие мероприятия. Отныне все цены будут указываться во франках и в евро. На выполнение этой программы выделены крупные средства. Намеченные мероприятия помогут французам освоиться с евро в переходный период с 1999 до 2002 года.

Исчезнет ли франк с приходом евро? Как пройдет переход на евро в заморских департаментах? Как перевести цены с франков на евро? Изменятся ли зарплаты, пенсии, доходы от сбережений? Эти и многие другие вопросы задают в настоящее время французы. Государственные власти полностью разделяют мнение Совета потребителей о том, что полная информация "необходима, чтобы наилучшим образом подготовиться к переходу на евро и ориентироваться в реформе". С этой целью были приняты меры, облегчающие прогрессивный переход на единую денежную систему. Проводится также широкая информационная кампания.

С 1 января 1999 года в одиннадцати европейских странах евро станет официальной денежной единицей. Монеты и банкноты же войдут в обращение лишь с 1 января 2002 года. И до июля месяца французы смогут одновременно использовать и франки, и евро. В этот переходный период жители должны научиться пользоваться новыми деньгами и считать в евро. Все желающие смогут открыть евросчет в банке и платить новыми деньгами с помощью специальной чековой книжки, а также расплачиваться в евро с помощью обычной кредитной карточки.

Граждане смогут переводить франки или евро в любую валюту. Для того чтобы научить потребителей считать в евро, начиная с 1999 года, крупные компании, поставляющие воду и электричество, а также телефонные компании будут рассылать своим клиентам счета в франках и в евро... Точно так же будет поступать администрация, рассылая сведения о зарплате, налоговые декларации и повестки об уплате. Государственные службы и органы местного самоуправления обязываются принимать платежи в новой денежной единице. Коммерсанты же со своей стороны должны будут указывать цены в двух валютах. Некоторые из них уже подготовили двойные ценники. Что же касается предприятий, то с 1999 года они должны будут вести всю бухгалтерию в новой валюте, конвертировать свой капитал и подавать налоговую декларацию, платить налоги и делать социальные взносы в евро.

Конвертировать в евро

Уже сейчас существует множество приспособлений, позволяющих с легкостью переводить цены в евро. Это и пластмассовые диски, и картонные линейки, наподобие логарифмических, и калькуляторы, переводящие цены по временному курсу евро... С 1999 года в продаже появятся специальные преобразователи, которые позволят быстро и главное точно конвертировать валюту. Кроме этого, Министерство экономики, финансов и промышленности с осени 1997 года проводит целый ряд мероприятий для информации населения. На это была отпущена сумма в 39 млн. франков (6,5 млн. долларов). Словом, все с нетерпением ждут разъяснений. Каждый гражданин должен располагать всей необходимой информацией, чтобы подготовиться к переходу на евро.

Для разъяснения сути денежной реформы было издано несколько брошюр. Например, "Банк де Франс" выпустил буклет "Курс на евро!" тиражом 100 000 экземпляров. Он адресован клиентам банка, профессиональным организациям, а также преподавателям, для которых банк подготовил также учебные материалы. Министерство образования должно, со своей стороны, обеспечить распространение информации среди учащихся.

Другое издание, специально подготовленное по этому случаю, — гид под названием "Евро и я", выполненный в форме закладки. Его можно будет получить в почтовых отделениях, банках, различных учреждениях и ассоциациях, а также по почте вместе с газетами. В брошюре на 16 страницах простым и доходчивым языком излагаются основные принципы перехода на евро. Что же касается Парижской биржи и профсоюза работников региональных ежедневных газет, то они уже выпустили 4 приложения под названием "Что такое евро", которые будут получать 20 млн. читателей.

Для получения необходимой информации в распоряжении французов также имеется бесплатный "зеленый телефон", адрес в Интернете и номер на минителе. Кроме этого подготовлена передвижная выставка под названием "Евро и деньги в Париже". Министерство экономики каждый семестр выпускает сводку по результатам опросов общественного мнения, которые проводит институт Sofres. Результаты опроса, опубликованного в октябре 1997 году, наглядно продемонстрировали, что мнение французов о евро изменяется в лучшую сторону.

Флоранс РЕЙНАЛЬ.

Традиционная осенняя регата в Венеции.

Беларусь — Германия

Немецкие полицейские неплохо спелись

В Бресте по приглашению местного музыкального общества находятся необычные гастролеры - участники немецкого хора полицейских из города Бахум земли Северный Рейн-Вестфалия.

Как стало известно корреспонденту БелТА, поющие полицейские уже выступили на Брестском ковровом комбинате, в колхозе "Советская Белоруссия" Каменецкого района, в областной детской больнице, куда, кстати, попутно доставили гуманитарную помощь. А еще гости посетили Беловежскую пущу и мемориальный комплекс "Брестская крепость-герой", были приняты главой администрации области Владимиром Заломаем, которому с целью налаживания более тесных контактов с немецкой землей передали приглашение посетить Германию.

Вечером 14 сентября хор немецких полицейских, а большинство из них и нынче трудятся на ниве укрепления правопорядка в своей стране, дал концерт в Брестском театре драмы и музыки. Перед отъездом на родину гости намерены еще раз побывать в детской областной больнице.

Иван КУКСА, БелТА.

Брест.

Данія падтрымае ўдзел Беларусі ў ахове Балтыйскага басейна

Місія Дацкага агенцтва аховы навакольнага асяроддзя, якую ўзначальвае каардынатар спецыяльнай праграмы для краін Усходняй Еўропы Ула Блат Бентсен, прыбыла ў нашу рэспубліку для вывучэння магчымасцей удзелу беларускіх прыродаахоўных ведамстваў у міжнародным праекце па захаванні Балтыйскага басейна. Госці маюць намер даследаваць стан водных артэрый Браслаўскага і Наваполацкага раёнаў, сустрэцца са спецыялістамі Віцебскага абласнога камітэта па ахове прыроды. У ходзе гэтага візіту будуць вызначаны неабходныя памеры грашовай дапамогі Беларусі для рэалізацыі шэрага тэхнічных мерапрыемстваў у прыгранічных раёнах.

Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў Мінпрыроды, Дацкае агенцтва аховы навакольнага асяроддзя за апошнія тры гады выдзеліла нашай рэспубліцы ўжо каля аднаго мільёна долараў на набыццё спецыяльнага абсталявання для кантролю за станам экалогіі ў шэрагу раёнаў Беларусі.

Таццяна СМІРНОВА, БелТА.

Далёкае — блізкае

Мікола КАПЫЛОВІЧ

Чорная зона

Адразу пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС я два гады працаваў на Брагіншчыне. На маіх вачах адсялялі жыхароў з забруджаных радыенуклідамі вёсак, а самі вёскі закопвалі бульдозерамі ў равы, або яны траплялі за агароджу трыццацікіламетровай зоны адчужэння, дзе не дазвалялася ні жыць, ні працаваць.

Прапаную чытачам газеты запісы са свайго блакнота, зробленыя ў той час.

Воўкасабакі

Толькі праз два тыдні пасля аварыі пачалі высяляць людзей з трыццацікіламетровай зоны — калі яны ўжо ўдосталь нахапаліся радыяцыі. Высялялі хоць і позна, затое знянацку і хутка. Адсяленцы не паспявалі ўзяць з сабою ў дарогу самае неабходнае. Усіх іх, можна сказаць, сілком грузілі ў кузавы машын, не давалі апамятацца. Яны спярша нават думалі, што зноў пачалася вайна. Таму і цяпер высяленцы дзеляць тую чарнобыльскую вясну на дзве часткі: "да вайны" і "пасля вайны".

Цяпер у выселеных вёсках стаіць самотная цішыня. Толькі часам пачуеш за калючым дротам у "чорнай зоне" жудаснае выццё і крыплае гаўканне:

— А-у-у! Гаў-гаў! А-у-у, гаў!

Ад гэткіх галасоў стынe ў жылах кроў. Міжволі заціскаеш далонямі вушы, каб іх не чуць.

Гэта галосяць воўкасабакі.

Пасля эвакуацыі ў выселеных вёсках засталося шмат сабак. Спачатку яны дбайна вартавалі свае двары, нікога ў іх не пускалі, спадзяваліся, што хутка вернуцца гаспадары. Доўга іх чакалі, але так і не дачакаліся. Сабак пачаў даймаць голад. Хутка яны налоўчыліся лавіць пакінутых тут курэй і гусей, а потым, калі тых не стала, пачалі есці ўсялякую здыхляціну. І неўзабаве далучыліся да ваўкоў. Яны разам пачалі паляваць на дзікіх жывёл. І хутка ў логавах, якія пачалі ладзіць у хлявах і стагах сена ці саломы, пачала выводзіцца новая парода драпежнікаў — воўкасабакі. Гэты гібрыд ад ваўкоў пераняў хітрасць, ненажэрнасць і жорсткасць, ад сабак — інтуітыўнае веданне псіхалогіі і паводзін чалавека. Калі ваўкі палявалі толькі ноччу і звычайна на сваёй тэрыторыі, то воўкасабакі, вырваўшыся з-за ахоўнага дроту, нападалі на хатнюю жывёлу за межамі "чорнай зоны". І ў любы час сутак. На вачах у разгубленых пастухоў вялікая зграя знянацку і рашуча ўрывалася ў статак, адлучала карову, шпарка гнала яе ў лес і там пачынала свой крывавы баль. Пакуль паклічуць паляўнічых — іх і след прастыў.

На якія хітрыкі толькі не ішлі паляўнічыя, каб вынішчыць гэтае драпежнае адроддзе: абкладвалі воўкасабак у час аблавы чырвонымі сцяжкамі, рабілі засады, ставілі капканы, атручвалі прынады — усё дарэмна.

Чалавечая "навука" за доўгія вякі, відаць, не прайшла для іх дарэмна.

Перапалох

Дэзактывацыяй у Брагіне займаліся спецыяльныя падраздзяленні, у якія звычайна прызываліся салдаты-запаснікі. Яны, апранутыя ў радыеахоўныя камбінезоны, абыходзілі з дазіметрамі вуліцы, двары, вызначалі найбольш насычаныя радыенуклідамі латкі зямлі, здымалі з яе радыеактыўны верхні пласт, загружалі яго рыдлёўкамі ў кузавы машын і адвозілі на магільнік.

Раптам вялікую латку зямлі з высокай канцэнтрацыяй нуклідаў ваенныя выявілі ў дворыку дзіцячага садка, дзе гулялі малыя, — прыбор аж зашкальвала! — і пачалі рабіць сваю будзённую справу. Выграбалі з-пад "грыбкоў" пясок, здымалі глебу... У гэты час выхавальніца вывела з памяшкання садка ў дворык на прагулку дзетак. Тыя адразу кінуліся на старой звычцы гуляць у радыеактыўныя пясочніцы.

Падлавіўшы гэты момант, адзін з брагінчан зазняў на плёнку дзяцей разам з дазіметрыстамі, захутанымі ў камбінезоны, з рэспіратарамі на тварах. Праявіў фотаплёнку і адаслаў некалькі фотакартак у рэспубліканскі друк. Адзін фотаздымак там надрукавалі.

І пачалося... Брагінскае начальства загадала міліцыі знайсці злоснага "наўмысніка, паклёпніка, дыскрэдытатара раёна". Цягалі ў міліцыю ўсіх вядомых і невядомых фатографаў. Нават фотакарэспандэнта раённай газеты дапытвалі. Міліцыя збілася з ног, але аўтара фотаабвінавачвання так і не выявіла. І давялося мясцовым кіраўнікам пісаць тлумачэнне вышэйшаму начальству. Напісалі ў Мінск, што такі факт у Брагіне не выяўлены. Маўляў, гэта фотакампаніцыя. Сталічныя начальнікі, вядома, паверылі тутэйшаму начальству і для "яснасці" справу замялі. Да наступнага такога выпадку.

Навалач

"Бяда адна не ходзіць, другую за сабою водзіць", — кажа народная прымаўка. Гэтае прымоўе вельмі ж падыходзіць, стасуецца да таго, што дзеецца ў зонах адчужэння і наступнага адсялення людзей пасля чарнобыльскай катастрофы... Узяць хоць бы той Брагінскі раён, які найбольш пацярпеў ад атамнай бяды. Адразу пасля эвакуацыі жыхароў з трыццацікіламетровай зоны тут рэзка падскочыла злачыннасць. У зону адсялення з усіх нор і закуткоў кінуліся на лёгкую здабычу крымінальнікі-марадзёры. Яны не толькі пачалі вывозіць пакінутую там высяленцамі маёмасць, паляваць на дзікіх жывёл, здзіраць з іх футра і прадаваць на кірмашах, але і падпальваць пабудовы. З іх агонь пачаў перакідвацца на зарослыя быльнікам палі і лясы. Радыяцыйны дым пачаў плысці з-за агарожы "чорнай зоны", асядаць на чыстыя ад нуклідаў мясціны. Але гэта яшчэ не ўсё. У навакольных вёсках з дазволу мясцовага начальства пакінутыя высяленцамі дамы пачалі засяляцца таджыкамі, цыганамі, кіргізамі, расійцамі... Чаму яны сюды едуць? Бо ёсць тут дармовае жыллё, заробак, "грабавыя", ёсць што ўкрасці, ёсць каго абрабаваць. Вядома, асабліва сюды пачалі з'язджацца з усёй былой "необъятной" тыя, хто не ладзіў з законамі сваіх цяпер ужо вольных краін і быў у пошуку праваахоўных органаў. Крымінагенны, як пішуць, элемент. "Навалач," — гавораць пра іх брагінцы. Гэтыя людзі прывезлі з сабою сюды і свае злачынныя звычаі і законы. Адразу і перш за ўсё яны аблюбавалі трыццацікіламетровую зону адчужэння і пачалі на сотках высяленцаў сеяць і вырошчваць опіумны мак, прадаваць яго ў гарадах і хутка багацець. Цяпер ужо беларускія наркаманы разам з наркатычнай атрутай пачалі спажываць і атамную. Двайны "букет". У раёне пачасціліся забойствы. Найбольш на нацыянальнай глебе. Таджык забівае кіргіза, армянін — грузіна. Варыянт мясцовага Карабаха. Брагінская міліцыя аж разгубілася ад частых забойстваў, крадзяжу і рабаўніцтва.

У апошні дзень, калі пакідаў Брагін, даведаўся яшчэ пра адно злачынства ў раёне.

Рэцыдывіст з Данецка, нейкі Алёхін, якога ласкава запрасілі на работу ў калгас "Шлях да камунізма", з фермы ўкраў двух парасят, прадаў іх, напіўся і парэзаў нажом мясцовага калгасніка. "Аддзякаваў" такім чынам кіраўнікам калгаса, калгаснікам за цёплы прыём. А ў калгасе імя Чапаева заезджыя злачынцы разам з палівам укралі бензавоз і пакацілі на ім на Украіну. Злачынны "інтэрнацыянал" дзейнічае тут з вялікім размахам і жорсткасцю.

Божа, каго толькі не прыгравала і не прыгравае на сваіх цёплых грудзях нашая беларуская зямля! З века ў век... І — ніякай падзякі. Адны толькі здзекі.

Яблыкі

Брагінскі кірмаш. Тут прадаюць часнок, цыбулю, слівы, грушы, яблыкі... Падыходжу да адной бабулькі. Яна расклала на хустцы яблыкі, сама сядзіць на драўлянай перавернутай скрынцы і сумуе. Яблыкі мне спадабаліся. Празрыстыя, жоўтыя, сакоўныя. Белы наліў. Цікаўлюся — адкуль.

— З Хракавіч, дзетка. Бяры, чыстыя. Бог мілаваў, пад радыяцыяй не былі. Не брагінскія. Каторыя пад атруту трапілі...

Купіў. Ведаю, што Хракавічы — адна з нешматлікіх вёсак, якую абмінула чарнобыльская бяда.

Назаўтра раніцай, ідучы вузкай вуліцай мястэчка, нечакана ўбачыў гэтую бабульку ў садзе. Яна збірала яблыкі.

— Дык вось дзе хракавіцкія яблыкі растуць, — спыніўся я. — І не сорамна вам імі людзей труціць? Бога пабойцеся.

— Хіба гэта атрута? — азвалася яна з-за плота. — Я і кампот з гэтых яблык вару, і варэнне. І сама ем. Глядзі!

Узяла з кошыка яблык, паднесла да рота і пачала грызці.

— Дык чаму ж учора казалі, што яблыкі з Хракавіч?

— Каб купіў, дзетка. Пенсія ў мяне малая. Адна жыву. Трэба ж нейкую капейку дома мець. На соль і хлеб...

Я адышоў і азірнуўся. Старая стаяла ў садзе і ціха плакала...

З кароваю — я чалавек

Парыпваючы і пахістваючыся, па вечаровай вясковай вуліцы Шкуратоў плыве ладны воз сена. З сена тырчаць ногі ў дзіравых пантофлях. Дзе ж гаспадар гэтых пантофляў? Заўважыў яго, калі воз праціснуўся праз вароты ў двор — з сена ссунулася на зямлю старэнькая сінявокая бабулька. Задыханая і змарнелая — ледзь на нагах стаіць.

— Навошта так гаруеце? Хіба ў вашыя гады сена касіць, сушыць, вазіць? А дзеці што?

— Дзеці? — уздыхнула яна. — Яны адразу пасля выбуху ў Гомель з'ехалі. Далей ад гэтай рацыі. І мяне цягнуць да сябе. Маўляў, тут жыць нельга.

— Дык чаму ж вы не паехалі?

— Не ўмею я жыць у горадзе. Што я там буду рабіць? А без работы я акалею, памру... Не па мне гарадская жытка... Я ж у вёсцы гадавалася, у сваіх Шкуратах... І цяпер гаспадарку тут вяду, кароўку трымаю... Яе ж не забярэш у горад... А без кароўкі нуда мяне згрызе... У горадзе... А тут... Увечары кладзешся спаць, пра Зорачку думаеш... Раніцай прачнешся: а як яна там у хляве? Увечары падоіш — на душы адляжа... А ў горадзе пра што будзеш думаць? Ні пра што... Там душу не будзе мне дзе дзець... Не, не, у горад не паеду... Мне каб кароўка ў двары была. З кароваю — я чалавек...

Па дзецях засумавала

Па забуцвелых і зарослых быльнікам палетках іду і прыходжу ў вёску Гдзень. Яе жыхароў вось-вось адсюль высяляць — з вёскі ў пагодны дзень можна бачыць трубы атамнага рэактара.

Ля канцавой скасабочанай хаткі на прызбе сядзіць бабулька. Падышоў — старая хлюпае ў прыпол. Па сухім маршчыністым твары кацяцца слёзы.

— Чаму плачаце? — пытаюся.

— Як тут не плакаць, — уздыхае яна. — Некалі нашая вёска звінела дзіцячымі галасамі. А цяпер аглухла, анямела нашая Гдзень. Усіх дзетак вывезлі пасля аварыі. Маіх унукаў таксама ў Мінск вывезлі... І анямела вёска без дзіцячага смеху. Засумавала я па дзетках... Цяпер думаю пра іх і плачу... Па дзіцячых галасах засумавала...

Міласэрнасць

У цёткі Ганны з вёскі Вуглы ў двары цэлая гайня — поўна сабак і сабачак. Пытаюся ў яе:

— Вы што, цётка, па вывядзенні сабак спецыялізуецеся?

— Па чым? — не адразу зразумела яна. — Сіроткі ўсе яны, пакінутыя мне суседзямі. Тымі, каго выселілі ад радыяцыі... Перад ад'ездам прыносяць сабак і сабачак, просяць: "Ратуй, цётачка, нашых дварняжак. Не прападаць жа ім". Усіх, што прыносілі, узяла. Часам і шчанюка сляпога прыносілі. "Навошта ён мне, — кажу, — я ж не нянька... Бяры з сабою ў горад". А праз гадзіну выходжу на ганак, шчаня там поўзае, у хату лезе. Шкада стане, малака нальеш. А калі нальеш — усё, больш не выганіш.

Суд

Что стоит за убийством еврейского парня?

(Продолжение. Начало в N157 за 1 сентября 1998 года.)

Целый месяц в суде города Минска проводится исследование материалов уголовного дела по убийству 3 июля прошлого года еврейского юноши Евгения Добромыслина. Судебный процесс начался с того, что стороны заявили ходатайства о приостановлении рассмотрения дела.

Пострадали Добромыслины из-за необъективности, на их взгляд, предварительного следствия. Обвиняемый Кабанов заявил, что к нему применяли недозволенные методы и отказался от показаний, данных на следствии. 20-летний Сергей Кабанов потребовал стационарной судебно-психиатрической экспертизы, поскольку, по его словам, из-за полученной в детстве травмы головы, он, совершая преступление, мог быть невменяемым и не отдавать должного отчета своим действиям. О психологическом давлении со стороны следствия заявила и 19-летняя Ольга Вель — обвиненная в реализации имущества, похищенного с квартиры убитого.

Суд отказал обвиняемому Кабанову в переводе из СИЗО в Новинки. Не удовлетворил ходатайство и родителей убитого, решив начать исследование дела в судебном процессе.

Проведено уже 20 заседаний. Заслушаны показания обвиняемых, пострадавших, свидетелей. Оглашены пять томов письменных материалов. За это время обозначились три версии хищения имущества Добромыслиных и убийства их сына.

